ЯКІМІ СТЫПЕНДЫЯМІ ЗААХВОЧВАЮЦЦА СТУДЭНТЫ?
Пры гэтым для студэнтаў БДУ павялічана квота па стыпендыях Прэзідэнта РБ
Стар. 2

ФІЛФАК ЖЫВЕ ПАД ДЭВІЗАМ: РОДНАЕ ВАРТА БЕРАГЧЫ!
Дэкан філалагічнага факультэта Іван РОЎДА пра юбілей філфака
Стар. 4–5

«УНІВЕРСІТЭТ ЗАДАЕ ЖЫЦЦЁВЫ ТОНУС!»
Інтэрв'ю з першай жанчынай-прарэктарам БДУ Вольгай ЧУПРЫС
Стар. 6

PROJECT WEEK BSU: АД ІДЭІ ДА ВЫНІКУ
170 удзельнікаў сабраў семінар для студэнцкага актыву
Стар. 8

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

13 снежня 2019 года, № 15 (2221)

Урачыстае адкрыццё кабінета беларускай мовы і культуры імя Янкі Купалы ў г. Санья

Старшы выкладчык факультэта журналістыкі Лізавета Хмель дэманструе рэктару БДУ Андрэю Каралю вынікі творчай падрыхтоўкі кітайскіх абітурыентаў

Наша дэлегацыя з кітайскімі навучэнцамі падрыхтоўчага цэнтра БДУ г. Санья, якія будуць паступаць у наступным годзе ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

БДУ пашырае супрацоўніцтва з Кітаем у галіне адукацыі і навукі

Вельмі выніковым стаў візіт дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём у КНР, дзе былі падпісаны пагадненні з Шанхайскім універсітэтам Цзяатун і Фашанскім універсітэтам, а таксама адкрыты культурна-адукацыйны цэнтр Беларусі ў г. Санья.

Шанхайскі ўніверсітэт Цзяатун

Мемарандум аб паразуменні паміж БДУ і Шанхайскім універсітэтам Цзяатун стаў першым дакументам, які афіцыйна замацоўвае доўгатэрміновае партнёрства паміж універсітэтамі ў развіцці міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі і тэхналогій.

Прадугледжваецца абмен студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі, запрашэнне выкладчыкаў і даследчыкаў для сумеснай працы над праектамі, а таксама абмен інфармацыяй, навучальнымі матэрыяламі і падрыхтоўка публікацый.

У рамках афіцыйнага візіту дэлегацыі БДУ была разгледжана сістэма падрыхтоўкі навуковых кадраў ва ўніверсітэтах і дэталёва прапрацавана пытанне ўдзелу першай групы беларускіх і кітайскіх студэнтаў, магістрантаў у летніх школах. Таксама рэктар БДУ Андрэй Кароль выступіў перад выкладчыкамі і студэнтамі Шанхайскага ўніверсітэта Цзяатун з лекцыяй «Навошта і дзе шукаць чалавека ў адукацыі: дыялог паміж Захадам і Усходам» і правёў прэзентацыю адукацыйных паслуг, навуковых дасягненняў і акадэмічнага патэнцыялу БДУ.

Даведка. Шанхайскі ўніверсітэт Цзяатун заснаваны ў 1896 г. і з'яўляецца адным з вядучых кітайскіх універсітэтаў. Уваходзіць у лігу С9 – альянс з дзевяці элітных ВНУ КНР. Займае 60 пазіцыю ў рэйтынгу найлепшых універсітэтаў свету QS World University Rankings. У ВНУ навучаюцца каля 30 тысяч студэнтаў на першай і другой ступенях. У выкладчыцкі склад уваходзяць больш за 1400 прафесараў, у тым ліку 15 членаў Кітайскай акадэміі навук.

Дзевяць гадоў запар лідзіраваў у краіне па колькасці даследчых праектаў, займае другое месца ў Кітаі па агульнай колькасці міжнародных і працытаваных публікацый і трэцяе – па колькасці артыкулаў, уключаных у індэкс цытавання SCI.

Культурна-адукацыйны цэнтр Беларусі ў Кітаі

У г. Санья на базе падрыхтоўчага цэнтра БДУ, які сёння праз адукацыйную дзейнасць актыўна спрыяе распаўсюджанню інфармацыі пра Беларусь у Кітаі, быў адкрыты кабінет беларускай мовы і культуры імя Янкі Купалы. Гэта аўдыторыя стане

Заканчэнне на 3-й стар.

УНІВЕРСІТЭТ
13 снежня 2019 года, № 15 (2221)

Якімі стыпендыямі заахвочваюцца студэнты?

Каля 70 студэнтаў нашага ўніверсітэта штогод заахвочваюцца спецыяльнымі стыпендыямі, якія, апроч матэрыяльных выгод, даюць іх уладальніку прэстыж, перавагі пры працаўладкаванні і нават некаторыя сацыяльныя прывілеі. У дадзеным матэрыяле прыводзім іх агляд з апошнімі зменамі.

Па інфармацыі Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці, у мэтах сацыяльнай падтрымкі і заахвочвання навучэнцаў, што выявілі здольнасці ў навучальнай і навукова-даследчай дзейнасці, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, а таксама дамовамі БДУ з зацікаўленымі арганізацыямі, для студэнтаў універсітэта ўсталяваны наступныя заахвочвальныя стыпендыі і выплаты:

1. ***Стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*** – студэнтам, якія асвойваюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I і II ступеняў, за выдатную паспяховасць на працягу ўсёй вучобы, асаблівыя поспехі ў навукова-даследчай і творчай дзейнасці, прыкладныя паводзіны, – 12 стыпендый;

за студэнтам, што атрымлівае стыпендыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, захоўваецца ўсталяваная навучальная стыпендыя.

2. ***Імянныя стыпендыі*** – студэнтам, курсантам, слухачам, якія асвойваюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I і II ступеняў, за дасягненне высокіх вынікаў у вучобе, высокіх паказчыкаў у навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай працы, – 31 стыпендыя, з іх:

Імя Францыска Скарыны 2
Імя А. Н. Сеўчанкі 5
Імя Якуба Коласа.....2
Імя Янкі Купалы 3
Імя Максіма Багдановіча 1
Імя Петруся Броўкі 1
Імя Кандрата Крапівы.....6
Імя Максіма Танка 1

для студэнтаў філалагічных факультэтаў:

Імя І. П. Шамякіна 5
Імя А. С. Пушкіна 1
Імя І. Я. Навуменкі 1

3. ***Прэмія «Партнёрства будучыні» пры ўдзеле ААТ «Белінвестбанк»*** з сертыфікатам вынікаў у вучобе, высокіх паказчыкаў у навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай працы, – 31 стыпендыя, з іх:

Імя Францыска Скарыны 2
Імя А. Н. Сеўчанкі 5
Імя Якуба Коласа.....2
Імя Янкі Купалы 3
Імя Максіма Багдановіча 1
Імя Петруся Броўкі 1
Імя Кандрата Крапівы.....6
Імя Максіма Танка 1

для студэнтаў філалагічных факультэтаў:

Імя І. П. Шамякіна 5
Імя А. С. Пушкіна 1
Імя І. Я. Навуменкі 1

3. ***Прэмія «Партнёрства будучыні» пры ўдзеле ААТ «Белінвестбанк»*** з сертыфікатам вынікаў у вучобе, высокіх паказчыкаў у навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай працы, – 31 стыпендыя, з іх:

Імя Францыска Скарыны 2
Імя А. Н. Сеўчанкі 5
Імя Якуба Коласа.....2
Імя Янкі Купалы 3
Імя Максіма Багдановіча 1
Імя Петруся Броўкі 1
Імя Кандрата Крапівы.....6
Імя Максіма Танка 1

для студэнтаў філалагічных факультэтаў:

Імя І. П. Шамякіна 5
Імя А. С. Пушкіна 1
Імя І. Я. Навуменкі 1

пра першачарговае права праходжання навучальнай і вытворчай практыкі ў ААТ «Белінвестбанк» – студэнтам 3–5 курсаў дзённай формы атрымання адукацыі, якія асвойваюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасцях «фінансы і крэдыт», «праваназнаўства», «эканамічная кібернетыка», за выдатную паспяховасць па выніках 2 (двух) апошніх семестраў, асаблівыя поспехі, перш за ўсё ў навуковых даследаваннях па актуальных пытаннях фінансавай дзейнасці, актыўную жыццёвую пазіцыю.

4. ***Грант «Стыпендыя Wargaming»*** – студэнтам 2–4 курсаў (акрамя выпускнога) фізічнага факультэта, хімічнага факультэта, факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, якія навучаюцца як за кошт сродкаў бюджэту, так і на ўмовах аплаты, пры ўмове абавязковага ўдзелу ў навукова-даследчай і сацыяльна-значнай дзейнасці, наяўнасці навуковых публікацый (3–4 курс) і сярэдняга бала акадэмічнай паспяховасці за 2 апошнія навучальныя семестры не ніжэйшага за 7,5, – 16 стыпендый.

Павялічыцца памер стыпендый і квота для БДУ

У сувязі з прыняццем Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2019 г. «Пра стымуляванне навуковай дзейнасці і ўдасканаленне аплаты працы» ўводзіцца новая сістэма налічэння і размеркавання стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і імянных стыпендый.

Навучэнцам у дзённай форме атрымання адукацыі прызначаюцца наступныя стыпендыі ў памерах, кратных **найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму** для працаздольнага насельніцтва, зацверджанага Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, за два апошнія кварталы:

навучальная стыпендыя студэнтам, што асвойваюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I і II ступені, – 0,3 і 0,48 адпаведна;

стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь студэнтам, курсантам, слухачам, якія асвойваюць змест праграм вышэйшай адукацыі I і II ступеняў, за выдатную паспяховасць на працягу ўсёй вучобы, асаблівыя поспехі ў навукова-даследчай і творчай дзейнасці, прыкладныя паводзіны – 0,48;

імянныя стыпендыі студэнтам, курсантам, слухачам, што асвойваюць змест адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі I і II ступеняў, за дасягненне высокіх вынікаў у вучобе, высокіх паказчыкаў у навукова-даследчай дзейнасці і грамадскай працы – 0,7.

Памеры дадзеных стыпендый павялічваюцца студэнтам БДУ ў 1,3 раза (ў параўнанні з іншымі ўВА).

Пры гэтым для студэнтаў БДУ павялічана квота па стыпендыях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь **з 12 да 18 стыпендый**.

Падрыхтавалі Сяргей ШАФАЛОВІЧ, Ірына БОБЕХ

Стыпендыі Wargaming

Шаснаццаць студэнтаў БДУ сталі пераможцамі першага конкурсу на суісканне стыпендыі Wargaming.

Па словах дырэктара кампаніі *Уладзіміра Кіслага*, гэты грант дазволіць ім публікаваць свае матэрыялы ў замежных выданнях, заказваць пераклад навуковых артыкулаў на замежныя мовы, аплачваць абсталяванне.

«Правядзенне конкурсу кампаніі Wargaming з'яўляецца добрым прыкладам прыватна-дзяржаўнага партнёрства. Такая сумесная праца дазваляе знайсці новыя індыкатары для матывацыі студэнтаў да навуковай працы», – адзначыла першы намеснік міністра адукацыі Беларусі *Ірына Старавойтава*.

Лаўрэатамі сталі студэнты чатырох факультэтаў БДУ па выніках 2018/2019 навучальнага года. У ліку стыпендыятаў навучэнцы хімічнага факультэта: *Кірыл Вярбіла, Яўген Ксяндзоў, Сямён Мажэйка, Анастасія Арловіч, Міраслаў Макарэвіч і Лізавета Сяргеева-Някрасава*. Ад фізічнага факультэта ў спісе пераможцаў *Валерыя Клапова, Дар'я Кісурына, Анатоль Кохан, Юлія Галабурда, Уладзіслаў Бараеў і Марына Чвек*. Таксама стыпендый ганараваны студэнты ФПМІ *Уладзімір Сакаловіч, Уладзіслаў Казлоўскі, Анастасія Шыманская* і студэнтка ФРКТ *Марыя Дзямідзік*.

Уладзімір Кіслы ўручае сертыфікат студэнтцы БДУ

Для атрымання гранта студэнтам неабходна было мець высокую адзнаку паспяховасці, падрыхтаваць матывацыйнае эсэ, аўтабіяграфію, а таксама весці навукова-даследчую дзейнасць.

Прэмія ад «Белінвестбанка»

Шэсць студэнтак БДУ пройдуць практыку ў «Белінвестбанку».

Сярод іх: чацвёртакурсніцы юрыдычнага факультэта *Дарыя Кузняцова, Паліна Сачава, Ганна Цыганкова*; магістрантка ФПМІ *Ганна Якубовіч*, студэнткі эканамічнага факультэта *Вікторыя Варанчук і Марыя Карпіцкая*. Такога права навучэнкі ганараваны за дасягнутыя поспехі ў вучобе, навукова-даследчай і творчай дзейнасці.

Сертыфікаты пра праходжанне практыкі студэнткам уручыў старшыня кіравання «Белінвестбанка» *Андрэй Брышцелеў (на фота)*. Ён падзякаваў універсітэту за супрацоўніцтва, адзначыўшы паспяховыя сумесныя праекты, сярод якіх інавацыйныя студэнцкі білет і пасведчанне супрацоўніка, разліковая сістэма «А!плаці». Андрэй Брышцелеў выказаў спадзяванне на працяг плённага партнёрства і анансаваны запуск міжнародный моладзевай карткі ISIC для студэнтаў БДУ.

УНІВЕРСІТЭТ
11 снежня 2019 года, № 15 (2221)

Падпісанне мемарандума з Шанхайскім універсітэтам Цзяатун

БДУ пашырае супрацоўніцтва з Кітаем у галіне адукацыі і навукі



Маршрут дэлегацыі БДУ

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

культурна-адукацыйным цэнтрам па папулярызацыі сярод кітайскіх грамадзян беларускай гісторыі, літаратуры, нацыянальных традыцый і выбітнасцяў. Адным са значных напрамкаў працы цэнтра з'яўляецца сацыякультурная адаптацыя замежных грамадзян у перыяд іх навучання ў нашай краіне.

Адкрыццё кабінета дазволіць слухачам лепш спазнаць самабытнасць, жыццёвы ўклад і нацыянальны каларыт беларусаў, папрацаваць з арыгінальнымі матэрыяламі па лінгвістыцы, гісторыі, мастацтве і краінаназнаўстве Беларусі.

Уся інфраструктура цэнтра пабудавана на беларускіх рэаліях. Дарэчы, навучальныя кабінеты маюць назвы станцый метро Мінска, сцены ўпрыгожаны фатаграфіямі, калажамі і карцінамі беларускіх асветнікаў, знакамітых турыстычных месцаў і рэгіёнаў. Кітайскім слухачам прадстаўлены фонд фільмаў, прэзентацый, твораў беларускіх пісьменнікаў, перыёдыкі айчынных СМІ, спіс якіх будзе рэгулярна папаўняцца пры падтрымцы БДУ.

Урачыстая цырымонія адкрыцця імянной аўдыторыі прайшла пры ўдзеле дэлегацыі беларускай ВНУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём, дырэктара падрыхтоўчага цэнтра Чжан Лэя, слухачоў і выкладчыкаў. У гэты дзень адбылося тэатралізаванае прадстаўленне кітайскіх навучэнцаў, якія падрыхтавалі музычна-танцавальныя нумары, вершы і песні на беларускай, рускай і кітайскай мовах.

Падрыхтоўчы цэнтр БДУ ў г. Санья (КНР) створаны ў 2018 г. з мэтай моўнай падрыхтоўкі кітайскіх абітурыентаў, якія плануюць паступленне ў БДУ. Сёння тут навучаюцца каля 140 слухачоў па навучальных праграмах беларускай ВНУ. Адбор адбываецца на конкурснай аснове з удзелам прадстаўнікоў 17 школ, трох універсітэтаў 12 правінцый Кітая. Таксама ў рамках афіцыйнага візіту ў КНР Андрэй Кароль правёў перамовы з кіраўніцтвам цэнтра пра пашырэнне супрацоўніцтва ў галіне сумеснай падрыхтоўкі спецыялістаў. Плануецца, што неўзабаве БДУ распрацуе праграмы павышэння кваліфікацыі для работнікаў сістэмы адукацыі, якія пройдуць навучанне на базе цэнтра. Акрамя таго, дасягнуты дамоўленасці пра павелічэнне кітайскіх слухачоў да 500 чалавек для падрыхтоўкі іх да паступлення ў БДУ.

Фашанскі ўніверсітэт

Шэраг партнёрскіх дамоў падпісалі БДУ і Фашанскі ўніверсітэт. Першы дакумент адлюстроўвае ўмовы супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі і пашырае прадметную галіну міжуніверсітэцкіх адносін. Да цяперашняга часу ўзаемадзеянне паміж установамі тычылася толькі біялогіі і біятэхналогій.

Другі дакумент накіраваны на ўмацаванне і пашырэнне навуковага супрацоўніцтва і прадугледжвае стварэнне англамоўнай сумеснай аспірантуры паміж БДУ і Фашанскім універсітэтам. Навучанне аспірантаў пройдзе па праграмах шэрагу біялагічных спецыяльнасцяў і пачнецца з новага навучальнага года. Дамова прапісвае правілы залічэння, умовы, а таксама месца правядзення дысертацыйных даследаванняў і іх абароны.

Былі прапрацаваны пытанні падрыхтоўкі сумесных адукацыйных праграм, абмену прафесарска-выкладчыцкім складам, арганізацыі моўных летніх школ для навучэнцаў. Акрамя таго, рэктар БДУ выступіў перад выкладчыкамі і студэнтамі кітайскага ўніверсітэта з лекцыяй на англійскай мове пра адукацыйныя інавацыі, а таксама прэзентаваў дасягненні ў галіне адукацыі і навукі БДУ.

Даведка. Фашанскі ўніверсітэт заснаваны ў 1958 годзе і з'яўляецца адным з найбуйнейшых у правінцыі Гуандун (КНР). З 2015 года ажыццяўляецца навучанне ў магістратуры. У кітайскім рэйтынгу ВНУ займае 284 пазіцыю сярод больш як 2200 універсітэтаў, а паводле міжнароднай ацэнкі ўваходзіць у 5 % найлепшых ВНУ свету.

У структуры ўніверсітэт 16 факультэтаў, у штаце працуе звыш 1500 выкладчыкаў, з якіх каля 500 прафесараў і дацэнтаў. На дадзены момант у ВНУ навучаецца каля 18 тысяч студэнтаў. Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па напрамках: літаратура і мастацтва, права і палітыка, навука, механіка, інфарматыка, экалогія і грамадзянскае будаўніцтва, бізнес, медыцына, педагагічныя навукі, фізічнае выхаванне і інш. Таксама ўніверсітэт вядзе актыўнае супрацоўніцтва больш чым з 180 прадпрыемствамі Кітая.

Фашань – адзін з найбольш старажытных гарадоў і адначасова адзін з тых гарадоў Кітая, якія найбольш дынамічна развіваюцца. Мае насельніцтва каля васьмі мільёнаў чалавек, фарміруючы з Гуачжоу і іншымі гарадамі дэльты Жамчужнай ракі найбуйнейшую ў Азіі гарадскую агламерацыю. Ён займае 15-ю пазіцыю сярод гарадоў Кітая па ВУП, з'яўляючыся найважнейшым цэнтрам аўтамабілебудавання, металургічнай, тэкстыльнай і мэблевай прамысловасці.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

01 снежня Доўгань Алена Фёдараўна, прафесар кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права

04 снежня Фурс Аляксандр Мікалаевіч, загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі

05 снежня Камкоў Васіль Нічыпаравіч, прафесар кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі

05 снежня Каралёва Ганна Анатольеўна, дэкан эканамічнага факультэта

05 снежня Магільны Уладзімір Васільевіч, прафесар кафедры фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі

07 снежня Якавец Аксана Генадзьеўна, дацэнт кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынеры раслін

10 снежня Новікава Вольга Уладзіміраўна, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі

10 снежня Паўлава Аляўціна Цімафееўна, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі

11 снежня Філімонаў Міхаіл Міхайлавіч, дацэнт кафедры біяхіміі

11 снежня Храмцоў Аляксандр Канстанцінавіч, дацэнт кафедры батанікі

16 снежня Жалнярэвіч Іван Іосіфавіч, дацэнт кафедры агульнай фізікі

20 снежня Міхалёва Алена Мікалаеўна, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай

20 снежня Шчэрбік Дзмітрый Васільевіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

26 снежня Емяльяненкаў Вадзім Іванавіч, дацэнт кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯўЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ сацыяльнай камунікацыі, фізічнай хіміі.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай і прыкладной механікі; камп'ютарных тэхналогій і сістэм; сацыяльнай камунікацыі; сацыялогіі; рускай літаратуры; раманскага мовазнаўства; канстытуцыйнага права.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: міжнароднай журналістыкі; вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі; агульнай матэматыкі і інфарматыкі; крымінальнага права, рускай літаратуры; раманскага мовазнаўства.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне па рабоце з персаналам, тэл. 209-54-36.

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ УСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БДУ
АБ'ЯўЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНАЙ ПАСАДЫ

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці «фізічная электроніка».

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэлефон 212-48-43.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

БДУ і Шанхайскі ўніверсітэт Цзяатун дамовіліся пра супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі і тэхналогій – БелТА, zviazda.by, «Спадарожнік», radiostalica.by, yandex.by (25.11), edu.gov.by, «Экапрэс», belaruschina.by (26.11).

БДУ і Фашанскі ўніверсітэт адкрылі сумесную англамоўную аспірантуру; культурна-адукацыйны цэнтр Беларусі пачаў працу ў Кітаі – БелТА (02.12), zviazda.by, yandex.by, belaruschina.by (03.12), mil.by (04.12).

У БДУ вынайдзены метад ацэнкі якасці дарожнага пакрыцця – zviazda.by (05.11), «Інтэрфакс» (06.11), sb.by (04.12), «Рэспубліка» (05.12).

У БДУ прайшла II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Досвед кітайскай палітыкі рэформаў і адкрытасці і яго актуальнасць для беларускай мадэлі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця» – БелТА, «Экапрэс», rambler.ru, primepress.by (14.11), pravo.by, «Сіньхуа» (15.11), «Настаўніцкая газета» (16.11).

Міжнародны студэнцкі экалагічны кангрэс прайшоў у БДУ – zviazda.by, «Экапрэс» (21.11), «Настаўніцкая газета» (26.11).

«Кар'ерны форум БДУ–2019» прайшоў ва ўніверсітэце – БелТА, sb.by, zviazda.by (27.11), «Экапрэс» (28.11), АНТ, 1-ы Нацыянальны канал Беларускага радыё (05.12).

VII Форум маладых журналістаў «Развіццё айчыннай журналістыкі на сучасным этапе і яе адказнасць перад грамадствам» стартаваў у БДУ – БелТА, zviazda.by, grodnonews.by, news.21.by, voran.by, n1.by (28.11), АНТ (29.11), sb.by, «Звязда», «Рэспубліка», «СБ. Беларусь сёння» (30.11), mininform.gov.by (02.12), «Мінскі кур'ер», «Настаўніцкая газета» (03.12).

Студэнты БДУ распрацавалі «інтэлектуальнае» ўпругожванне, прызначанае для маніторынгу навакольнага асяроддзя – sb.by, mlyn.by (04.12), «Інтэрфакс» (05.12).

Студэнты ФПМІ БДУ выйшлі ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні сярод студэнтаў – tut.by, kv.by (02.12), zviazda.by, «Інтэрфакс» (03.12).

Новыя віды пахавальнага абраду другой паловы X–першай паловы XI стагоддзя раннесярэднявечнага насельніцтва паўночнай Беларусі выяўлены навукоўцамі БДУ – «Інтэрфакс», yandex.by (02.12), zviazda.by (03.12).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
13 снежня 2019 года, № 15 (2221)

УНІВЕРСІТЭТ
11 снежня 2019 года, № 15 (2221)

Філфак жыве пад дэвізам: роднае варта берагчы!

Філалагічнаму факультэту, на якім студэнты адкрываюць для сябе глыбіню і шматграннасць мастацкага слова, – 80 гадоў! Пра яго мінулае і сучаснасць распавёў дэкан прафесар Іван РОЎДА. Даведаліся, якія тэхналогіі дапамагаюць навучаць філолагаў, раскрываць таямніцы моў, літаратур і культур народаў – беларускага, рускага, іншых славянскіх, заходнееўрапейскіх і ўсходніх.

ФОТА ПРЭС-СЛУЖБЫ ФІЛФАКА, ВАСІЛЯ КУЗЬМІЧКІНА

– Раскажыце, як фарміраваўся факультэт, які стаў альма-матар для многіх класікаў беларускай літаратуры.

– Падрыхтоўка філолагаў у БДУ вядзецца з дня заснавання ўніверсітэта – з 1921 года. Да 1931 года спецыялістаў па мове і літаратуры рыхтавалі на этнолагалінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта. Потым падрыхтоўка філолагаў у БДУ на 8 гадоў была перапынена. А ў 1939 г. адраджэнне філалагічнай адукацыі ва ўніверсітэце адбывалася ўжо на новым узроўні. Менавіта з гэтага года і вядзецца адлік нашага летапісу.

Вялікая Айчынная вайна перапыніла дзейнасць факультэта. Толькі ў маі 1943 г. Савет Народных Камісараў СССР прыняў пастанову аб аднаўленні работы ўніверсітэта на станцыі Сходня Хімкінскага раёна Маскоўскай вобласці. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў БДУ вярнуўся ў Мінск. Наступныя дзесяцігоддзі адзначаліся колькасным і якасным развіццём факультэта: адкрываліся новыя аддзяленні, рэарганізоўваліся кафедры. З філфака ў свой час «выйшлі» аддзяленні журналістыкі, логікі і псіхалогіі, якія з'яўляюцца сёння самастойнымі падраздзяленнямі ўніверсітэта.

Першым дэканам філфака быў вядомы вучоны-лінгвіст прафесар **Цімафей Ломцеў**. Факультэт у розныя часы ўзначальвалі **Міхаіл Ларчанка**, **Аляксей Волк**, **Алег Лойка**, **Ларыса Мурына**.

Важна паважаць і памятаць усіх людзей, выкладчыкаў і студэнтаў, якія ўнеслі асабісты ўклад у станаўленне і развіццё філфака. На факультэце сёння дзейнічаюць

навуковыя школы прафесараў А. А. Лойкі, В. П. Рагойшы, Л. А. Мурынай, Т. І. Шамякінай, П. П. Шубы, А. Я. Супруна, Л. М. Шакуна.

– На філфаку студэнты вывучаюць 17 моў. Існуе 14 спецыяльнасцяў. Як удаецца спалучаць іх у адзіным адукацыйным працэсе?

– Дадзеныя розныя спецыяльнасці аб'ядноўвае сама філалогія, нашы студэнты вывучаюць мовы і літаратуры скрозь прызму беларускай і сусветнай культуры. Дзякуючы гэтаму, нашы навучэнцы і атрымліваюць глыбокія гуманітарныя веды. Ёсць агульныя дысцыпліны, якія выкладаюцца на ўсіх спецыяльнасцях, гэта найперш беларуская і руская мовы і літаратуры, замежная літаратура, тэорыя мовазнаўства, літаратуразнаўства, філасофія, гісторыя. Нездарма Д. С. Ліхачоў пісаў, што філалогія – гэта найвышэйшая форма гуманітарнай адукацыі, форма, якая злучае ўсе гуманітарныя навукі.

Разам з тым адзначу, што падрыхтоўка студэнтаў па шэрагу спецыяльнасцяў («класічная філалогія», «славянская філалогія», «ўсходняя філалогія») у нашай краіне вядзецца толькі на філалагічным факультэце БДУ. Калі казаць пра самыя папулярныя спецыяльнасці сярод абітурыентаў, то апошнія гады высокая запатрабаванасць «рускай філалогіі», дзе амаль усе месцы займаюць медалісты і пераможцы алімпіяд. Папулярная таксама «ўсходняя (кітайская) філалогія» – там традыцыйна самыя высокія балы і вялікі конкурс. Набіраем абітурыентаў як на бюджэтную, так і на платную форму навучання.

– Якой камандай супрацоўнікаў рыхтуеце прафесійныя кадры?

– Сёння ў структуру факультэта ўваходзяць 14 кафедраў. Навучальны працэс забяспечваюць каля 200 выкладчыкаў, сярод якіх 24 дактары і 102 кандыдаты навук. Якасную падрыхтоўку філолагаў ажыццяўляюць на нашым факультэце ў тым ліку і запрошаныя лектары – носьбіты мовы з замежных універсітэтаў. У сваю чаргу, спецыялісты філфака выкладаюць беларускую, рускую мовы і літаратуры ў Польшчы, Украіне, Сербіі, Славакіі, Кітаі, Аўстрыі.

Па падручніках і вучэбных дапаможніках, падрыхтаваных выкладчыкамі філфака, займаюцца студэнты філалагічных факультэтаў Беларусі і замежных краін. Нашы супрацоўнікі ўваходзяць у аўтарскія калектывы па напісанні падручнікаў для ўстаноў сярэдняй адукацыі Беларусі.

На факультэце шмат увагі надаецца навуцы. Сіламі кафедраў і вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору распрацоўваецца 27 навуковых тэм, з якіх 11 – у межах дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (падпраграма «Беларуская мова і літаратура»). На факультэце функцыянуюць 3 саветы па абароне доктарскіх дысертацый, у якіх штогод абараняюцца аспіранты і дактаранты філфака, іншых ВНУ Беларусі, а таксама замежныя грамадзяне. Толькі сёлета былі абаронены дысертацыі 4 замежных суіскальнікаў. Такая колькасць саветаў сведчыць аб тым, што факультэт валодае высокім навуковым патэнцыялам, дзякуючы чаму ён застаецца адным з асноўных цэнтраў краіны па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

На філфаку навучаюцца 10 дактарантаў і 80 аспірантаў (у тым ліку 10 замежных), штогод выпускнікі аспірантуры і супрацоўнікі факультэта абараняюць каля 10 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Навуковая актыўнасць нашых супрацоўнікаў выяўляецца і ў тым, што яны кожны год бяруць удзел больш чым у 250 канферэнцыях самага рознага ўзроўню, з якіх амаль палова – замежныя.

– Дарэчы, што тычыцца міжнароднага вопыту: з якімі краінамі супрацоўнічаеце?

– Факультэт даволі актыўна заяўляе пра сябе ў міжнародным адукацыйнай прасторы, вядзе сумесную навукова-даследчую і вучэбна-метадычную працу.

Нашымі партнёрамі з'яўляюцца больш за 20 замежных універсітэтаў краін Усходняй і Заходняй Еўропы, Кітая, Японіі, Паўднёвай Карэі і, зразумела, Расіі. Напрыклад, не першы год рэалізуецца праект з *Альдэнбургскім універсітэтам (Германія)*. Выкладчыкі, магістранты і аспіранты дзвюх устаноў выконваюць праекты, якія скіраваны на даследаванне беларускай мовы і літаратуры ў еўрапейскім кантэксце. Дзякуючы дастаткова інтэнсіўнаму супрацоўніцтву з універсітэтамі Кітая, практычна ўсе студэнты «кітайскай філалогіі» маюць магчымасць за перыяд вучобы адзін семестр правесці на стажыроўцы ў Паднябеснай. Апроч таго, якасную падрыхтоўку кітаістаў на нашым факультэце забяспечваюць, поруч з беларускімі, кітайскія выкладчыкі, якія вядуць заняткі на кожным курсе.

У сваю чаргу, шмат замежных навучэнцаў абіраюць філфак для вучобы. У бягучым годзе факультэт лідзіруе па колькасці прынятых на 1 курс замежных студэнтаў. Усяго ж на факультэце вучыцца каля 400 чалавек з 16 краін. Традыцыйна мы прымаем найбольшую колькасць замежных грамадзян (пераважна з Еўропы) на вучэбную і навуковую стажыроўкі. Да нас прыязджаюць вывучаць не толькі рускую, але і беларускую мову. У прыватнасці, зараз на філфаку вучыцца магістрант Сунь Байлун з Пекінскага ўніверсітэта замежных моў, дзе ён пачаў вывучаць беларускую мову, а тут паглыбляе свае веды і ўдасканальвае валоданне мовай.

– Сёння якаснае навучанне патрабуе адпаведных тэхнічных умоў і магчымасцяў. Якімі рэсурсамі валодае філфак?

– Факультэт актыўна пашырае выкарыстанне лічбавых тэхналогій у навучальным працэсе ў самых розных формах: як у абсталяваных адпаведнай тэхнікай аўдыторыях, так і дыстанцыйна. Сёння факультэт мае 12 спецыялізаваных кабінетаў – своеасаблівых цэнтраў па вывучэнні замежных моў і літаратур, абсталяваных сучаснай мультымедыйнай тэхнікай, дзякуючы ў тым ліку і матэрыяльнай падтрымцы замежных пасольстваў, а таксама цэнтр інфармацыйных тэхналогій, 25 мультымедыйных аўдыторый, 6 камп'ютарных класаў і 3 лінгафонныя кабінеты. Ёсць кабінет-музей беларускай народнай культуры, вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору.

Пра высокі ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў сведчаць перамогі навучэнцаў філфака ў міжнародных конкурсах. Так, у 2019 годзе студэнтка філфака *Аляксандра Чабан* стала пераможцай нацыянальнага адборачнага тура конкурсу па кітайскай мове і прадставіла нашу краіну на міжнародный алімпіядзе ў Кітаі.

– Дзе студэнты філфака могуць праявіць свае таленты акрамя вучобы?

– На факультэце дзейнічае 9 моладзевых грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання. Студэнты займаюцца ў аматарскіх тэатрах, дыскусійных клубах, літаратурных аб'яднаннях, фальклорных калектывах, бавяць час у кінаклубах, на вечарах жывой музыкі, балях, турэлётах. У нас ёсць нават уласная прэс-служба.

Сіламі студэнтаў і выкладчыкаў ладзяцца ўжо добра вядомыя ва ўніверсітэце мерапрыемствы. Напрыклад, *Тыдзень беларускай мовы*, які прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы. Мы першыя ў краіне пачалі адзначаць гэта свята ў такіх маштабах і штогод працягваем традыцыю. Запрашаем на факультэт цікавых людзей, славутых выпускнікоў, каб паказаць студэнтам магчымасці філалогіі, слова. Гэты тыдзень прысвячаем усім мовам, якія ў нас вывучаюцца, удзельнічаюць у мерапрыемствах і замежнікі, і прадстаўнікі іншых факультэтаў.

Вялікую цікавасць выклікае і *патрыятычна-асветніцкая акцыя «Вязынка»*. Кожны год у маі мы выязджаем на радзіму Янкі Купалы. На гары, якую студэнты назвалі «тутэйшым Парнасам», праходзяць спартыўныя мерапрыемствы, конкурсы і гульні. Гэта падзея выйшла за межы факультэта, мы шчыра запрашаем гасцей з іншых падраздзяленняў універсітэта.

Яшчэ на факультэце ладзяцца *Дзень першакурсніка*, *конкурсы «Міс факультэта»* і *«Містар факультэта»* (хоць у нас няшмат хлопцаў), *Калядны дабрачынны баль* і шмат чаго іншага.

– Наколькі запатрабаваныя вашы выпускнікі?

– Мы спраўдліва ганарымся сваімі выпускнікамі і тымі, хто ў нас працаваў. Так, 8 з 17 народных паэтаў і пісьменнікаў вучыліся і працавалі на факультэце: *Якуб Колас*, *Кандрат Крапіва*, *Пятрусь Броўка*, *Іван Мележ*, *Іван Навуменка*, *Ніл Гілевіч*, *Рыгор Барадулін*, *Іван Чыгрынаў*. Пра фундаментальнасць і разам з тым універсальнасць падрыхтоўкі спецыялістаў на філалагічным факультэце сведчыць той факт, што нашы выпускнікі паспяхова працуюць ва ўсіх сферах гуманітарнай дзейнасці чалавека – гэта ўстановы адукацыі, навуковыя цэнтры, радыё, тэлебачанне, рэдакцыі газет і выдавецтвы, бібліятэкі, музеі, не абыходзяцца без нашых выпускнікоў і дыпламатычныя ўстановы. Многія з выпускнікоў з'яўляюцца выбітнымі асобамі ў нашай краіне і вядомыя за яе межамі. Нашых выхаванцаў характарызуюць як дасведчаных і камунікатыўных людзей. Такія патрэбныя ў любой арганізацыі на розных пасадах.

– На вашу думку, што вылучае філфак сярод іншых факультэтаў?

– У першую чаргу наш факультэт вылучаецца сваім творчым духам. Зразумела, мы не лунаем у надхмарных вышынях, а ідзём у нагу з сучаснымі патрабаваннямі, інфармацыйнымі тэхналогіямі. Але, як бы ні былі насычаны нашыя аўдыторыі тэхнічнымі сродкамі, галоўнае – не згубіць гэты творчы пачатак у выкладчыках і студэнтах.

Сёння філфак дае глыбокія і рознабаковыя веды ў галіне літаратуразнаўства, мовазнаўства і культуры, тэорыі і практыкі перакладу, камп'ютарных лінгвістычных тэхналогій, лінгвістычнай крыміналістыкі і інш. Мы сталі найбуйнейшым рэспубліканскім цэнтрам у галіне славістыкі, класічнай філалогіі, кітайскай мовы і літаратуры, займаем вядучую пазіцыю па падрыхтоўцы русістаў сярод замежных студэнтаў.

– Якія перспектывы чакаюць філалагічны факультэт?

– Неўзабаве з'явяцца новыя профілі, напрамкі магістратуры. Факультэт будзе насычацца тэхнічнымі сродкамі навучання, ўкараняцца новыя формы, прыёмы і методыкі вучэбнага працэсу. Будзем пашыраць дыстанцыйныя праграмы навучання.

Гутарыла
Алена ЛЯЎШЭНЯ

Філфак у лічбах

(даныя на снежань 2019 г.)

17 моў вывучаюць студэнты на філфаку

14 спецыяльнасцяў

Падрыхтоўка студэнтаў па спецыяльнасцях «класічная філалогія», «славянская філалогія», «ўсходняя філалогія» у нашай краіне вядзецца толькі на філалагічным факультэце БДУ

24 дактары і **102** кандыдаты навук. На факультэце функцыянуюць 3 саветы па абароне доктарскіх дысертацый

420 замежных студэнтаў з **16** краін. У бягучым годзе факультэт лідзіруе па колькасці прынятых на 1 курс замежных студэнтаў

8 з 17 народных паэтаў і пісьменнікаў вучыліся і працавалі на факультэце: **Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Іван Мележ, Іван Навуменка, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Іван Чыгрынаў**

Факультэт мае 12 спецыялізаваных кабінетаў, 25 мультымедыйных аўдыторый, 6 камп'ютарных класаў, 3 лінгафонныя кабінеты, 1 цэнтр інфармацыйных тэхналогій

УНІВЕРСІТЭТ
13 снежня 2019 года, № 15 (2221)

Вольга Чупрыс:

«Універсітэт задае жыццёвы тонус»

Вольга ЧУПРЫС – першая жанчына ў гісторыі БДУ на пасадзе прарэктара. Гэта паслужыла падставай для інтэрв'ю, якое мы ўзялі ў Вольгі Іванаўны для нашай газеты ў пачатку снежня. Пакуль нумар рыхтаваўся да друку, стала вядома пра яе прызначэнне на пасаду намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта ў чарговы раз пацвердзіла прызнанне прафесійных якасцяў Вольгі Чупрыс і высокі давер да нашага ўніверсітэта ў цэлым.

Мала хто ў дзяцінстве марыць стаць юрыстам, але…

– Спачатку мама бачыла ўва мне музычнага педагога, паколькі я паспяхова вучылася па класе фартэпіяна. Потым з такім жа захапленнем я займалася і лёгкай атлетыкай. Менавіта спартыўная падрыхтоўка сфарміравала важныя асабістыя якасці: сабранасць, настойлівасць, рашучасць, мэтанакіраванасць.

Я была выдатніцай у школе. Высокая паспяховасць, актыўная грамадская дзейнасць прадвызначылі мой прафесійны выбар.

Вучаніца 3 класа СШ № 2 г. Мінск Вольга Чупрыс

У старэйшых класах канчаткова вырашыла звязаць сябе з юрыспрудэнцыяй. Мама скончыла філалагічны факультэт БДУ. Таму я таксама абрала БДУ, юрыдычны факультэт – я лёгка паступіла, здаўшы, як медаліст, на выдатна ўсяго адзін экзамен. Сямейную эстафету прыняў мой старэйшы сын – ён таксама выпускнік юрыдычнага факультэта. Так БДУ стаў лёсавызначальным універсітэтам для маёй сям'і.

Цудоўны час

Студэнцтва запомнілася сваёй імклівасцю, павышанай адказнасцю да вучобы. Асноўную частку групы складалі студэнты з вопытам работы, а выпускнікоў школ, у асноўным медалістаў, было няшмат. Мы, учарашнія школьнікі, хутка сталелі ў такім асяроддзі. Нягледзячы на рознаўзроставасць, група была згуртаванай і дружнай. Да гэтага часу сустракаемся з аднакурснікамі і згадваем той цудоўны час.

Пра гендарную роўнасць і няроўнасць

Кіраўнік па традыцыі асацыіруецца з мужчынам. Але, думаю, не трэба дзяліць кіраўнікоў, супрацоўнікаў на мужчын і жанчын. Любы кіраўнік, незалежна ад полу, абавязаны валодаць усімі патрэбнымі прафесійнымі кампетэнцыямі і асобаснымі якасцямі, мець арганізатарскія здольнасці, знаходзіць эфектыўнае рашэнне вытворчых задач, стратэгічна мысліць, правільна дэлегаваць паўнамоцтвы і ацэньваць вынікі. У супрацоўніках цаню адказнасць, дысцыплінаванасць, уменне чуць, працаваць у камандзе, знаходзіць кампраміс і прапаноўваць рашэнне праблемы.

БДУ – гэта ўніверсітэт вялікіх магчымасцяў

БДУ – гэта мая альма-матар, дзе я адбылася як выкладчык, навуковец і кіраўнік. Універсітэт з'яўляецца інтэлектуальным эпіцэнтрам нашай краіны, тут сабраліся ўнікальныя, цікавыя і вядомыя людзі, камунікацыя з якімі ўзбагачае, прыносіць велізарнае задавальненне і дае імпульс да многіх смелых рашэнняў. Побач з такімі людзьмі не стаіш на месцы, развіваешся.

Універсітэт – гэта студэнты, ад якіх заўсёды атрымліваеш пэўны зарад энергіі. Хочацца, каб наша моладзь прагнула ведаў, была актыўнай у грамадскім, навуковым і спартыўным жыцці ўніверсітэта. БДУ валодае вялікімі магчымасцямі і ўмовамі для самарэалізацыі кожнага студэнта, але толькі пры асабістым жаданні і намаганнях самога навучэнца.

БДУ ў свой юбілейны перыяд выступае моцным лідарам па многіх паказчыках сярод рэспубліканскіх і замежных універсітэтаў. Хацелася б, каб ён і далей развіваўся, прырастаў добрымі студэнтамі, каб дружны калектыў не шкадаваў сваіх магчымасцяў і сіл.

Працоўная дзейнасць Вольгі Іванаўны Чупрыс у БДУ пачалася з 1997 года. У 1998 годзе абараніла дысертацыю на суісканне вучонай ступені кандыдата юрыдычных навук на тэму: «Канстытуцыйна-прававыя праблемы грамадзянства ў краінах Садружнасці Незалежных Дзяржаў: параўнальна-прававы аналіз».
У 2010 годзе абараніла дысертацыю на суісканне вучонай ступені доктара юрыдычных навук на тэму: «Тэарэтычныя праблемы прававога рэгулявання дзяржаўнай службы Рэспублікі Беларусь».
У 2016 годзе прысвоена вучонае званне прафесара.
У БДУ прайшла шлях ад выкладчыка юрыдычнага факультэта да прарэктара па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях (студзень 2018 г. – снежань 2019 г.).

Лічу, мы заслугоўваем высокага статусу ў спісе найлепшых універсітэтаў дзякуючы вынікам, дасягнутым нашым працавітым і старанным калектывам.

Пра малую радзіму і самае асабістае

Я мінчанка, але малой радзімай лічу Лагойскі раён, адкуль родам бацькі. Менавіта там я праводзіла вакацыі ў бабуль, знаёмілася з прыгажосцю нашай беларускай прыроды, даведвалася ўсю спецыфіку сельскага жыцця. Непаўторны час, выдатныя ўспаміны: усё лета ездзіла на веласіпедзе, купалася ў рэчцы, чытала кнігі… Памятаю, як у суседняй школе іграла на фартэпіяна, а мясцовыя дзеці прыбягалі паглядзець у акенца і паслухаць мае кампазіцыі.

Сям'я – самае важнае ў жыцці кожнага чалавека. Я шчаслівая мама траіх сыноў. Старэйшы выбраў маю прафесію, скончыў юрфак БДУ, цяпер працуе ў пракуратуры. Сярэдні – будучы педыятр. А малодшы яшчэ вучыцца ў школе і на сёння бачыць сябе ў галіне ІТ. Вольны час праводжу з карысцю для сябе, гэта актыўныя віды спорту – лыжы, плаванне, бег. І, вядома ж, не ўяўляю свайго жыцця без кніг.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

Жадаем Вользе Іванаўне моцнага здароўя, далейшай плённай дзейнасці, новых ідэй і дасягненняў на новай пасадзе!

Вольга Іванаўна Чупрыс з'яўляецца кіраўніком падгрупы групы экспертаў у галіне права пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, член Навукова-кансультатыўнага савета пры Вярхоўным Судзе. Супрацоўнічае з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі. Член грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў».
На новай пасадзе намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга Іванаўна Чупрыс будзе курыраваць пытанні заканадаўчага рэгулявання, арганізоўваць працу па карэкціроўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

УНІВЕРСІТЭТ
11 снежня 2019 года, № 15 (2221)

Уладзімір Суораў абраны старшынёй Пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі

У БДУ абмеркавалі дзейнасць прафсаюза работнікаў БДУ за мінулыя пяць гадоў

У справаздачна-выбарнай канферэнцыі пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў БДУ прынялі ўдзел больш за 320 дэлегатаў. Былі агучаны даклады пра дзейнасць прафсаюзнага камітэта і рэвізійнай камісіі ППА работнікаў за перыяд з 2014 да 2019 года.

Падчас канферэнцыі адбыліся выбары старшыні Пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў. Кіраўніком абраны **Уладзімір СУВОРАЎ**, дацэнт кафедры геамет-рыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі механіка-матэматычнага факультэта, яго намеснікам – ***Васіль Амялюсік***, старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту. Працоўны прэзідыум узначаліў ***Іван Янушэвіч***, прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ.

У рамках пасяджэння ўдзельнікі абмеркавалі дзейнасць прафсаюза работнікаў БДУ за мінулыя пяць гадоў. Як адзначыў Уладзімір Суораў, прафкам прымае актыўны ўдзел у жыцці ўніверсітэта. Праца ППА накіравана ў першую чаргу на абарону працы супрацоўнікаў БДУ.

Прафкам удзельнічаў у арганізацыі грамадскага кантролю над выкананнем патрабаванняў аховы працы і заканадаўства аб працы. За пяць гадоў ажыццёўлена распрацоўка і ўдасканаленне калектыўных дамоў. У выніку сумеснай працы па выкананні калектыўнай дамовы за справаздачны перыяд 108 сем'яў работнікаў БДУ пабудавалі кватэры па коштах, істотна ніжэйшых за рынкавыя.

За справаздачны перыяд была выпрацавана новая фінансавая палітыка арганізацыі, дзякуючы якой ППА набыла фінансавую ўстойлівасць і празрыстасць. Пры гэтым у дастатковай меры захавалася фінансавая самастойнасць цэхавых арганізацый.

Спартыўна-масавая камісія ППА (старшыня В. А. Амялюсік) сумесна з кафедрай фізічнага выхавання і спорту арганізоўвала працу груп «Здароўе». Тут работнікі БДУ маглі займацца агульнай фізічнай падрыхтоўкай і ўдасканальваць сваё спартыўнае майстэрства (бясплатнае наведванне басейна, спартыўных, гульнявых, трэнажорных зал). На высокім узроўні праводзіліся ўжо традыцыйныя спартакіяды «Здароўе» і дні здароўя. Штогод ППА работнікаў БДУ займала прызавыя месцы ў агляд-зеконкурсе прафсаюза на найлепшую пастаноўку спартыўнай працы сярод пярвічных прафсаюзных арганізацый ВНУ краіны.

Калі гаварыць пра аздараўленне работнікаў універсітэта, то тут выкарыстоўвалася ўласная база БДУ – САК «Брыганціна», дзе арганізоўваўся адпачынак сем'яў супрацоўнікаў (дзве змены ў жніўні). Работнікам, якія маюць патрэбу ў санаторна-курортным лячэнні і набываюць пуцёўкі за поўны кошт, аказвалася матэрыяльная дапамога.

Актыўна працавала культурна-масавая камісія прафкама (старшыня А. У. Кінчыкава). За справаздачны перыяд было арганізавана і праведзена больш за 20 экскурсійных праграм, у якіх прынялі ўдзел 2500 турыстаў з ліку работнікаў універсітэта, арганізоўвалася калектыўнае наведванне канцэртных залаў, тэатраў, праводзіліся ўрачыстыя мерапрыемствы.

Камісія па ахове працы і тэхніцы бяспекі прафкама (старшыня А. Ф. Нікіценка) рэгулярна ўдзельнічала ў планавых праверках, якія праводзяцца сумесна з упраўленнем па ахове працы і надзвычайных сітуацыях БДУ.

Таксама на пасяджэнні адзначалася тое, што прафсаюзным камітэтам праводзілася значная ўнутрысаюзная праца. Арганізацыйная структура ППА была прыведзена ў адпаведнасць са Статутам галіновага прафсаюза. У выніку прафсаюзныя арганізацыі МДЭІ імя А. Д. Сахарава і НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі рэарганізаваны ў цэхавыя арганізацыі ППА работнікаў БДУ.

Падводзячы вынікі мінулага перыяду, прафкам паставіў перад сабой і шэраг задач. А менавіта: наладзіць інфармацыйна-аналітычную працу, арганізаваць эфектыўную работу па падборы нарматыўных дакументаў, распрацоўцы мерапрыемстваў, накіраваных на садзейнічанне дасягнення мэт развіцця БДУ, на працу са зваротамі работнікаў, распрацоўку працэдуры разгляду праблемных сітуацый, арганізацыю ўнутрысаюзнага кантролю. А яшчэ ў планах распрацоўваць і рэалізоўваць сумесныя падыходы да працы з ветэранамі БДУ і моладдзю, мерапрыемствы да прафесійных свят, фарміраваць архіў, летапіс.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

БДУ стаў удзельнікам міжнароднага праекта «Эразмус+»

Першая працоўная нарада партнёраў па праекце «Развіццё накіраванай на студэнтаў практыка-арыентаванай адукацыі ў галіне мадэлявання кіберфізічных сістэм (КФС)» прайшла 5–6 снежня на базе БДУ.

Праект разлічаны на тры гады і з'яўляецца працягам ужо рэалізаваных праграм ЕС: «Тэмпус» (2012–2014 гг.) і «Эразмус+» (2015–2018 гг.), якія былі прысвечаны распрацоўцы новых навучальных праграм у галіне фізікі.

– У папярэдніх праектах у нас склалася паспяховае партнёрства, і з'явілася жаданне яго развіваць, – адзначае **Анатоль Забашта**, прадстаўнік галаўной арганізацыі па праекце, доктар Рыжскага тэхнічнага ўніверсітэта. – Працуючы ў новым праекце, мы ад абмеркавання метадаў падрыхтоўкі спецыялістаў па мадэляванні КФС пераходзім да практыкі: мадэрнізацыі існуючых і распрацоўкі новых навучальных праграм. Пры распрацоўцы мы будзем арыентавацца на запатрабаванні рынку працы, неабходна даць студэнтам тыя веды, якія рэальна патрэбныя. Для гэтага мы прыцягнулі шэраг асацыяваных партнёраў: Беларускае фізічнае таварыства, Рэспубліканскую асацыяцыю нанаіндустрыі, АТ «Інтэграл», Інстытут ядзерных праблем БДУ, Дзяржаўную акцыянерную кампанію харкаўскіх аўтавакзалаў, Інстытут кібернетыкі імя В. М. Глушкова НАНУ – яны будуць даваць кансультацыі і ацэньваць новыя курсы.

Спецыялісты ў галіне камп'ютарнага мадэлявання і кіравання КФС шырока запатрабаваны ў сферах, звязаных з камп'ютарнай бяспекай, транспартам, лагістыкай, кіраваннем электразабеспячэння і г. д. Падрыхтоўка такога роду спецыялістаў немагчымая без выкарыстання новых педагагічных падыходаў і методык навучання, у тым ліку заснаваных на ІКТ.

– Цяпер наш універсітэт праходзіць лічбавую трансфармацыю, адзін з кірункаў якой – змена адукацыйнага працэсу, гэта значыць распрацоўка сістэмы пастаяннай уцягнутасці студэнта. Ён павінен мець магчымасці вучыцца, проста ўзяўшы ў любы момант у рукі мабільны тэлефон. Для гэтага выкарыстоўваюцца анлайнавыя адукацыйныя платформы, – распавядае **Аляксандр Фядотаў**, старшы выкладчык кафедры камп'ютарнага мадэлявання фізфака БДУ. – У рамках праекта «Эразмус+» плануецца распрацаваць больш за 20 новых навучальных курсаў і 9 электронных падручнікаў з інтэрактыўнымі элементамі. Таксама мы распрацуем адзін буйны анлайн-курс па матэматычнай фізіцы, які ў перспектыве павінен выйсці на такія знакавыя адукацыйныя платформы, як EdX і Coursera. А на базе платформы Moodle БДУ будзе створана сістэма для мадэлявання і сімуляцый. Акрамя таго фінансаванне праекта на закупку абсталявання дазволіць аснасціць навукова-навучальную лабараторыю па камп'ютарнай фізіцы і набыць некалькі сістэм Google Jamboard – гэта інтэрактыўныя дошкі, у якіх інтэгравана сістэма для запісу відэа і аўдыя, з іх дапамогай мы зможам арганізоўваць анлайн-сесіі і трансляцыі ў анлайн-курсах і запісваць відэалекцыі.

У лік ВНУ-партнёраў увайшлі тры беларускія ўніверсітэты (акрамя БДУ гэта Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны і Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна), тры украінскія (Харкаўскі нацыянальны аўтамабільна-дарожны інстытут, Крыварожскі нацыянальны ўніверсітэт, Чарнігаўскі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт), а таксама тры ўніверсітэты краін ЕС (Рыжскі тэхнічны ўніверсітэт, Латвія; Лювенскі каталіцкі ўніверсітэт, Бельгія; Кіпрскі ўніверсітэт, Кіпр). Беларускія студэнты атрымаюць магчымасць у рамках праекта наведаць універсітэты-партнёры краін ЕС і папрактыкавацца ў іх лабараторыях.

Валерыя БАНДАРЧЫК

УНІВЕРСІТЭТ
13 снежня 2019 года, № 15 (2221)

Project week BSU: ад ідэі да выніку

У выязным адукацыйным семінары для студэнцкага актыву на базе САК «Брыганціна» прынялі ўдзел больш за 170 чалавек з пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ, каардынацыйнага савета органаў студэнцкага самакіравання Студэнцкага гарадка БДУ, а таксама ПА ГА «БРСМ».

Змяшаныя каманды ў самыя кароткія тэрміны распрацоўвалі творчыя праекты, найлепшы з якіх у перспектыве можа быць рэалізаваны ў нашым універсітэце. Семінар такога фармату праводзіўся ўпершыню.

Каманды ўдзельнікаў былі сфарміраваны выпадковым чынам яшчэ да ад'езду ў «Брыганціну». За кожнай з іх быў замацаваны свой «тымлід», які каардынаваў сумесную дзейнасць актывістаў з розных арганізацый. На папярэднім этапе перад кожнай з каманд была пастаўлена задача стварыць свой унікальны вобраз, якога яны павінны былі прытрымлівацца на працягу ўсяго семінара.

Урачыстае адкрыццё пачалося з прадстаўлення каманд, кожная з якіх за хвіліну павінна была прадставіць сябе і паказаць загадзя падрыхтаваную «візітоўку». З першых жа хвілін была зададзена высокая планка крэатыву. Удзельнікі паказалі, што, нягледзячы на наяўнасць немалой колькасці арганізацый унутры БДУ, усе яны з'яўляюцца часткамі аднаго вялікага пазла. Адна з каманд паспрабавала вярнуцца ў мінулае і выправіць памылкі ў працы над праектам, які не адбыўся. Іншая каманда распавяла, куды трапляюць актывісты пасля таго, як перастаюць быць актывістамі. Журы ж у сваю чаргу заставалася толькі здзіўляцца палёту фантазіі моладзі.

Але і арганізатары не засталіся ўбаку і падчас насычанай адукацыйнай праграмы падзяліліся з удзельнікамі семінара сваім досведам у распрацоўцы праектаў, распавялі пра свае поспехі і няўдачы падчас адукацыйных воркшопаў.

Начальнік Псіхалагічнай службы БДУ **Руслан Папок** падчас агульнага трэнінгу на камандаўтварэнне дапамог згуртаваць усіх членаў калектыву і настроіў усіх на плённую сумесную дзейнасць.

Дзмітрый Мікулка (начальнік аддзела стартап-цэнтра БДУ) распавёў, як правільна расстаўляць мэты і прыярытэты, працуючы над новым праектам, і дасягаць іх. У жывой інтэрактыўнай форме спікер звярнуў увагу на тое, што шлях да галоўнай мэты складаецца з мноства маленькіх задач, кожную з якіх трэба здолець дасягнуць, прыклаўшы для гэтага нямала высілкаў і энергіі.

На працягу двух дзён кожны спікер імкнуўся здзівіць слухачоў незвычайнай формай падачы матэрыялу, рознымі творчымі заданнямі для каманд. Гаворка ішла пра правілы планавання і арганізацыі сваёй справы, пра крэатыўнае мысленне, развіццё прамоўніцкіх здольнасцяў, пытанні матывацыі каманды падчас працы над праектам. Каманды змаглі пазнаёміцца з паспяховымі праектамі БДУ розных гадоў і з цяжкасцямі, якія ўзнікалі на шляху іх рэалізацыі. Апроч гэтага, атрымалі карысныя парады для працы ў інфармацыйнай прасторы сацыяльных сетак.

На другі дзень семінара творчае напружанне ў «Брыганціне» не спадала. Увесь досвед, атрыманы ад майстроў, хлопцы і дзяўчаты вырашылі актыўна прымяніць у падрыхтоўцы сваіх праектаў. Каманды праводзілі розныя апытанні сярод студэнтаў, кансультаваліся ў экспертаў, рыхтавалі прэзентацыйныя матэрыялы для абароны і трэніравалі прамоўніцкае майстэрства.

І вось надышоў доўгачаканы вечар абароны праектаў. Кожны ўпэўнены, што менавіта яго праект з'яўляецца самым найлепшым, самым цікавым і самым годным, каб быць рэалізаваным ва ўніверсітэце. Сваімі яркімі выступленнямі, глыбокім веданнем тэматыкі ўдзельнікі спрабуюць схіліць меркаванне журы ў бок прадстаўленага імі праекта. У сваю чаргу, члены журы, каб абраць найлепшых з лепшых, зладзілі сапраўдны краштэст, задаючы падступныя пытанні, правяраючы аўтараў праектаў на трываласць.

На трэці дзень семінара каманды даведаліся доўгачаканыя вынікі іх працы. Першае месца ў конкурсе заняла каманда «Чортаў тузін» з праектам ***BSU Lounge Zone***. Яна прапанавала стварыць на базе нашага ўніверсітэта ўтульную прастору, дзе студэнты маглі б адпачыць паміж парамі. Па задумцы аўтараў, такое месца зможа стаць зручнай пляцоўкай для правядзення сходаў і невялікіх мерапрыемстваў студэнцкага актыву БДУ.

Другое месца дасталася праекту ***BSU FEST 100***, сутнасць якога заключалася ў правядзенні маштабнага фэсту да 100-годдзя БДУ на тэрыторыі аднаго з паркаў горада. Праект прадстаўляла каманда «Боршч».

І, нарэшце, трэцяе месца заслужыў праект ***«Студэнт 3.0»*** з ідэяй пра змену сістэмы выбару дадатковых прадметаў падчас вучобы ва ўніверсітэце.

Акрамя таго, былі падведзены вынікі агульнакаманднага заліку. У тройцы прызёраў апынуліся ўжо знаёмыя каманды. На першым месцы размясцілася каманда ***«Боршч»***, другую пазіцыю заняў ***«Чортаў тузін»***, а замкнулі тройку прызёраў хлопцы з каманды ***Men in black***, яны ж сталі пераможцамі музычнага квіза, які прайшоў у першы дзень семінара.

На закрыцці ўсе пераможцы атрымалі заслужаныя ўзнагароды. Не засталіся без увагі і «тымліды», якія кіравалі камандамі на этапе падрыхтоўкі і падчас семінара.

Падводзячы вынік, скажам, што семінар «Project week BSU: ад ідэі да выніку» даў магчымасць сябрам з розных падраздзяленняў універсітэта пазнаёміцца адзін з адным, а таксама прадэманстраваць свае інтэлектуальныя і творчыя здольнасці, а яркім вынікам іх сумеснай творчасці сталі шматлікія цікавыя праекты, якія ў перспектыве могуць быць рэалізаваны ў нашым універсітэце.

Юлія ВІЦЕНЬ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

13 снежня 2019 года
Падпісана да друку 11.12.2019 г.
Зак.. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by